# БЕЛАРУСКІ ДЫЗАЙН У ПЕРЫЯД ПАСЛЯВАЕННАГА АДНАЎЛЕННЯ БЕЛАРУСКАЙ ПРАМЫСЛОВАСЦІ

# БЕЛОРУССКИЙ ДИЗАЙН В ПЕРИОД ПОСЛЕВОЕННОГО ВОССТАНОВЛЕНИЯ БЕЛОРУССКОЙ ПРОМЫШЛЕННОСТИ

# BELARUSIAN DESIGN IN THE PERIOD OF POST-WAR RESTORATION OF THE BELARUSIAN INDUSTRY

***Я.Ю. Ленсу***

***Я.Ю. Ленсу***

***Ya.Yu. Lensu***

Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў,
Беларусь, Мінск, *lensu50@inbox.ru*
Белорусская государственная академия искусств,
Беларусь, Минск, *lensu50@inbox.ru*
Belarusian State Academy of Arts,
Belarus, Minsk, *lensu50@inbox.ru*

Разглядаецца развіццё беларускага дызайну ў перыяд пасля Вялікай Айчыннай вайны, калі рэспубліка адраджала сваю народную гаспадарку пасля фашысцкай акупацыі. Аналізуецца паступовы працэс станоўлення прафесійнага дызайну ад “упрыгажэнства” канца 1940-х – першай паловы 1950-х гадоў да функцыянальнай эстэтыкі 1960-х, калі ў СССР дызайн стаў укараняцца ў савецкую эканоміку на дзяржаўным узроўні.

*Ключавыя словы:* дызайн; Вялікая Айчынная вайна; прамысловасць; тэхнічная эстэтыка; мастацкае канструяванне.

Рассматривается развитие белорусского дизайна в период после Великой Отечественной войны, когда республика возраждала свое народное хозяйство после фашистской оккупации. Анализируется постепенный процесс становления профессионального дизайна от «украшательства» конца 1940-х — первой половины 1950-х годов до функциональной эстетики 1960-х, когда в СССР дизайн стал внедряться в советскую экономику на государственном уровне.

*Ключевые слова:* дизайн; Великая Отечественная война; промышленность; техническая эстетика; художественное конструирование.

The article describes the development of belarussian design in the period after the Great Patriotic War, when the republic revived its national economy after the Nazi occupation. The incremental advance of the formation of professional design is analyzed from the “decoration” of the late 1940s - the first half of the 1950s to the functional aesthetics of the 1960s, when in the USSR design began to be introduced into the Soviet economy at the state level.

*Keywords*: design; the Great Patriotic War; industry; technical aesthetics; artistic construction.

У 1941 годзе пачалася Вялікая Айчынная вайна. Вайна нанесла велізарны ўрон эканоміцы Беларускай савецкай сацыялістычнай

рэспублікі. Фашысцкія захопнікі спалілі і разбурылі ў Беларусі 209 гарадоў і раённых цэнтраў, 9200 вёсак, 10338 прамысловых прадпрыемстваў, было знішчана ці вывезена ў Германію каля 90% матораў, машын, станкоў і абсталявання. Але з 1943 года паступова пачалося вызваленне беларускіх тэрыторый ад нямецкіх акупантаў. На вызваленых тэрыторыях адразу пачыналася работа па аднаўленні народнай гаспадаркі. Да канца 1945 года было адноўлена 1667 буйных прамысловых прадпрыемстваў, некалькі тысяч сярэдніх і дробных. Сталі даваць прадукцыю станкабудаўнічыя заводы Мінска, Віцебска, Гомеля. Часткова былі адноўлены Гомсельмаш, Барысаўскі дрэваапрацоўчы камбінат, абутковая фабрыка імя Э. Тэльмана ў Мінску і інш.

Паступова аднаўлялася гордасць даваеннай Беларусі – шкларобчая прамысловасць. Запрацавалі Барысаўскі завод крышталя імя Ф.Э. Дзяржынскага і шклозавод "Нёман", якія ізноў сталі выпускаць сваю прыгожую прадукцыю. Знамянальна, што вядомы савецкі скульптар і выдатны мастак па шклу В.І. Мухіна ў 1948 годзе абрала менавіта шклозавод "Нёман" для вырабу сваіх твораў, прызначаных для масавай вытворчасці. Яна асабіста прыязджала ў Беларусь, у Бярозаўку, дзе знаходзіцца завод, каб кіраваць выкананнем работы, якая выконвалася па дзяржаўнаму заказу.

У Беларускай ССР ў пасляваенны час не толькі адраджаліся старыя прамысловыя прадпрыемствы, але і будаваліся новыя. Так, ужо ў 1944 годзе, амаль адразу пасля вызвалення Мінска, у беларускай сталіцы пачалі будаўніцтва аўтазавода. Першая ж грузавая машына сышла з канвеера МАЗа ў 1947 годзе. Гэта быў аўтамабіль МАЗ-205, які ствараўся з удзелам маскоўскіх дызайнераў, сярод якіх быў патрыярх савецкага аўтадызайну Ю. Далматоўскі. Усёй краіне тады стала вядома выразная эмблема ў выглядзе бягучага зубра. Грузавікі з беларускай маркай працавалі ва ўсіх кутках нашай тады неабдымнай дзяржавы. "Пяцітонка", як называлі першую мадэль МАЗа, мела вельмі выразны вонкавы выгляд. Каробчатая з геаметрычнымі формамі кабіна, прамавугольны абрыс матора, кузаў з актыўна выяўленымі рэбрамі цвёрдасці на металічных бартах, колы з буйным рэльефам пратэктараў на шыных – усё ў форме самазвала "працавала" на стварэнне вобраза моцнай машыны. Безумоўна, удала была зроблена і эмблема бягучага зубра, якую распрацаваў сам Ю. Далматоўскі. Яна мацавалася на радыятары аўтамабіля і сімвалізавала яго сілу. Нездарма гэтыя грузавікі называлі ў тыя гады "Зубрамі".

У 1946 годзе ў Мінску пачынае будавацца трактарны завод, які даў першую прадукцыю ўжо ў 1948 годзе. Спачатку гэта былі пускавыя рухавікі, з 1950 года завод стаў выпускаць гусенічныя сельска-

гаспадарчыя і тралёвачныя трактары, а пазней – колавыя сельскагаспадарчыя трактары "Беларусь" на пнеўмашынах. У 1958 годзе на Сусветнай выстаўцы ў Бруселі беларускі трактар ТДТ-60 і грузавы аўтамабіль МАЗ-530 былі ўдастоены вышэйшай узнагароды "Гран-пры" як за іх тэхнічныя якасці, так і за добры дызайн.

Такім чынам, дызайн паступова стаў пранікаць у прамысловасць Беларусі, авалодваючы пакуль толькі некаторымі лідыруючымі ў тэхнічных і сацыяльных адносінах галінамі вытворчасці, але гэта быў ужо добры сімптом абуджэння творчай дзейнасці ў напрамку працы над візуальнай формай прамысловай прадукцыі.

У 1950-я гады ў Беларускай ССР паступова пачынае развівацца вытворчасць тавараў народнага спажывання. Пачынаюць выпускацца масавымі серыямі радыёпрыёмнікі, тэлевізары, свяцільні, прасы, пазней – фотаапараты, халадзільнікі, газавыя пліты. Трэба сказаць, што ў першай палове 1950-х гадоў названыя вырабы не адрозніваліся адметнымі якасцямі дызайну, бо прафесійных дызайнераў у рэспубліцы практычна не было, за знешні ж выгляд прамысловай прадукцыі адказвалі тыя ж інжынеры-канструктары, якія распрацоўвалі тэхнічную аснову выраба. Робячы рэчы на свой густ, яны надавалі ім рысы ўпрыгажэнства, эклектызму, часта іх кампазіцыі грашылі перагружанасцю элементаў, дробнасцю форм. Прыкладам такога формаўтварэння сярод беларускіх вырабаў радыётэхнічнай прадукцыі таго часу можа служыць прыёмнік "Беларусь-53". Гэты аб'ект характарызаваўся масіўнасцю формы, складанасцю аб'ёмнай кампазіцыі, пэўнай раздробленасцю элементаў формы. Радыёпрыёмнік у вялікай колькасці аздаблялі розныя дэкаратыўныя накладкі, акантоўкі. Складанасцю і дробнасцю формы адрозніваліся ручкі настройкі. У больш позніх мадэлях радыёпрыёмнікаў гэтага перыяду "Мінск" і "Мінск-Т", нягледзячы на пэўнае імкненне да большай цэласнасці і лаканічнасці кампазіцыі, таксама назіраецца перагружанасць і цяжкаватасць формы, тут таксама ў вялікай колькасці выкарыстоўваюцца дэкаратыўныя накладкі і акантоўкі.

Аналагічныя рысы формаўтварэння – ўпрыгажэнства і складанасць кампазіцыі – характарызуюць радыёлы, якія выпускаліся ў той час у нашай рэспубліцы. Гэтакая, напрыклад, радыёла "Мінск-Р-7", якая была зроблена ў 1951 годзе. Яна мела асіметрычную кампазіцыю па вертыкальным чляненні, але гэтая спроба знайсці больш цікавы вобраз рэчы зводзілася на ніштo перагружанасцю правай часткі, за кошт чаго атрымлівалася зрокавая неўраўнаважанасць формы. Цяжкаватасцю і ўскладненасцю формы пры незгарманаванасці складаных элементаў характарызавалася і радыёла "Беларусь-59".

Першыя беларускія тэлевізары 1950-х гадоў знаходзіліся пад уплывам агульных тэндэнцый формаўтварэння айчынных радыёвырабаў таго часу, зразумела, з улікам тэхнічных асаблівасцяў гэтых апаратаў. Возьмем, напрыклад, тэлевізар "Беларусь-4". Як і радыёпрыёмнікі і радыёлы таго часу, ён мае масіўную, груваcткую форму, з мэтамі надання аб'екту якасцей дэкаратыўнасці ўводзяцца розныя накладкі і акантоўкі. Варта адзначыць, што ў формаўтварэнні аб'ектаў яшчэ не знайшлася характэрная для тэлевізараў больш позніх часоў рыса, калі асноўны функцыянальны элемент – экран – дамінуе ў кампазіцыі над усімі астатнімі кампанентамі. У дадзеай мадэлі экран пасаджаны занадта глыбока і некалькі губляецца ва ўсёй кампазіцыі выраба.

Тэндэнцыі ўпрыгажэнства ў першай палове 1950-х гадоў авалодалі і формамі іншых відаў тавараў народнага спажывання, якія выпускаліся ў Беларускай ССР. Напрыклад, гадзіннікі, якія рабіліся на мінскім заводзе "Прамень", мелі даволі складаныя па пластыцы карпусы з багатым дэкаратыўным аздабленнем, з актыўнай рэльефнасцю паверхняў. Упрыгажэнствам адрознівалася і асвятляльная арматура, якая пачала вырабляцца ў нашай рэспубліцы ў 1950-я гады. Падвесы і бра першай паловы дзесяцігоддзя мелі пампезныя, манументальныя формы. На панэлях мацавання бра да сцяны і на вялікіх круглых разетках, якімі забяспечваліся столевыя свяцільні, наносіўся складаны рэльефны дэкор, часцей за ўсё расліннага характару, у які часам уводзілася і палітычная сімволіка ў выглядзе пяціканцовых зорак ці сярпа з молатам.

У другой палове 1950-х гадоў у СССР у сферы рэчавага формаўтварэння адбываюцца значныя змены. У гэты час пачынаюцца рэформы ў галіне архітэктуры і будаўніцтва. Падвяргаецца суровай крытыцы "ўпрыгажэнства" канца 1930-х – першай паловы 1950-х гадоў. У архітэктуры пераходзяць да праектавання простых, пазбаўленых дэкору дамоў, бярэцца накірунак на будаўніцтва добраўпарадкаваных кватэр для засялення адной сям'і. У сувязі з гэтым адбываецца змена форм абсталявання жытла, бытавых машын і прыбораў. Напрыклад, выпушчаныя ў гэты час беларускія радыёлы "Мінск-61" і "Беларусь-62" набываюць больш простыя, лаканічныя формы, чым вырабы папярэдняга перыяду. Іх кампазіцыя больш цэльная, форма пазбаўлена складаных паверхняў. Спрошчаныя формы ў гэты час набываюць і гадзіннікі мінскага завода "Прамень", іх карпусы не аздабляюцца арнаментальнымі ўпрыгажэннямі, лаканічна вырашаецца графіка цыферблатаў.

У другой палове 1950-х гадоў пачынаецца выпуск айчыннай фотаапаратуры. Першанцам беларускага фотаапаратабудавання была

камера “Змена-2”, створаная ў 1957 годзе на Мінскім механічным заводзе (цяпер завод імя С.І. Вавілава). Камера была простая, шкальная, разлічвалася на юных спажыўцоў. Форма фотаапарата была характэрная для айчынных камер 1950-х гадоў – некалькі ўскладненая пластыка, прыступкавая верхняя частка, кампазіцыйна вылучаныя органы кіравання. Корпус апарата выраблўся з пластмасы чорнага колеру, тубус жа аб’ектыва, кругавая шкала адлегласці, органы кіравання – з белага паліраванага металу. Гэткі кантраст светлых металічных дэталяў і цёмнай пластмасы – таксама своеасаблівасць савецкіх фотакамер тых часоў.

За “Зменай-2” былі выпушчаны фотаапараты “Эстафета” і “Школьнік”. Апошні меў вельмі простую канструкцыю, яго спажывецкая прыналежнасць вызначалася ўжо ў самой назве, камера ж “Эстафета” мела больш складаную канструкцыю і разлічвалася на больш вопытнага фатографа. Па формаўтварэнню абодва апараты падпарадкоўваліся стылістычным плыням 1950-х гадоў. Асабліва характэрны ў гэтых адносінах быў пластмасавы корпус фотаапарата “Школьнік”, які меў абцякальную, некалькі вычварную форму.

Пазней на Мінскім механічным заводзе была створана малафарматная камера “Вясна” і яе мадыфікацыя “Вясна-2”. Апошняя была арыгінальнай і для свайго часу самай кампактнай камерай. У знешняй форме яна аб’яднала новыя рысы формаўтварэння фотаапаратаў наступаючых 1960-х гадоў – кампактнасць, адсутнасць выступання органаў кіравання ад корпуса, і ў той жа час прыкметы стылістыкі камер папярэдняга дзесяцігоддзя – абцякальная форма, скругленне граняў корпуса.

У канцы 1950-х – пачатку 1960-х гадоў у пачаўся таксама выпуск халадзільнікаў. Першай халадзільнай установкай, зробленай на Мінскім заводзе электрахаладзільнікаў, быў “Мінск-125”. Гэты халадзільнік манціраваўся ў кухонны стол прамавугольнай формы. Яго рабочая паверхня была пакрыта слаістым пластыкам, а футарал быў зроблены з дрэва – характэрная рыса айчынных халадзільнікаў таго часу, калі яны маскіраваліся пад кухонную мэблю.

Тады ж сталі выпускацца ў Брэсце і першыя газавыя пліты “П-2-1” і “Брэст-2”. Яны таксама атрымалі вобраз стала ці тумбачкі на высокіх ножках. Пліта мела гафрыраваныя металічныя крылы, якія пашыралі яе рабочую паверхню, але не вельмі арганічна ўпісваліся ў кампазіцыю аб’екта. Наогул рэч адрознівалася дробнасцю і незгарманаванасцю элементаў формы.

Такім чынам, нягледзячы на тое, што ў другой палове 1950-х гадоў у нас адбыліся пэўныя зрухі ў пошуках новых падыходаў да формаўтварэння аб'ектаў рэчавага свету, усё ж формы прамысловых вырабаў, якія ствараліся ў Беларусі, характарызаваліся многімі хібамі, яшчэ не было дасягнута патрэбнага прафесійнага ўзроўню мастацкага канструявання названых аб'ектаў. Наогул трэба сказаць, што, нягледзячы на пэўныя пазітыўныя змены ў рэчавым формаўтварэнні, якія вызначыліся ў СССР у гэты час, эстэтычныя якасці большасці савецкіх прамысловых вырабаў заставаліся ўсё ж на дастаткова нізкім узроўні. І тады, у пачатку 1960-х гадоў, на хвалі "касыгінскай" эканамічнай рэформы савецкі ўрад вырашыў "зверху" ўкараніць дызайн у айчынную вытворчасць. 28 красавіка 1962 года выйшла пастанова Савета Міністраў СССР "Аб паляпшэнні якасці прадукцыі машынабудавання і тавараў культурна-бытавога прызначэння шляхам укаранення метадаў мастацкага канструявання". Пастанова адыграла вялікую ролю ў развіцці айчыннага дызайну – цяпер дызайн афіцыйна ўключаўся ў існуючую сістэму праектна-канструктарскіх работ.

Савецкае кіраўніцтва ўскладала на дызайн вялікія надзеі. Стаўка была зроблена на дызайн. У дызайнераў паверылі, ім далі "карт бланш". Гэта і ў саміх дызайнераў усяліла веру ў велізарныя магчымасці сваёй прафесіі, "прафесіі будучага", як яе часам называлі ў савецкім друку. Нашы дызайнеры з запалам узяліся за справу. У 1962 годзе ў Маскве быў створаны Усесаюзны навукова-даследчы інстытут тэхнічнай эстэтыкі (УНДІТЭ). На яго ўскладаліся наступныя функцыі: распрацоўка і ўкараненне метадаў мастацкага канструявання, вызначэнне патрабаванняў тэхнічнай эстэтыкі да розных вырабаў машынабудавання і тавараў культурна-бытавога прызначэння, каардынацыя навукова-даследчых работ у галіне мастацкага канструявання.

У 1966 годзе робіцца новы крок у арганізацыйным развіцці савецкага дызайну: ствараецца адзіная дзяржаўная сістэма мастацка-канструктарскіх арганізацый, у якую ўвайшлі УНДІТЭ як галаўны цэнтр гэтай сістэмы, створаныя ў саюзных рэспубліках філіялы УНДІТЭ, галіновыя спецыяльныя мастацка-канструктарскія бюро і галаўныя мастацка-канструктарскія арганізацыі, дызайнерскія групы, бюро і аддзелы прадпрыемстваў, НДІ, СКБ і інш. арганізацыі. У 1966 годзе быў адкрыты Беларускі філіял Усесаюзнага навукова-даследчага інстытута тэхнічнай эстэтыкі, які стаў ударнай сілай дызайну ў рэспубліцы.